# Беларуская мова і літаратура ў школ

3 1991

# Беларуская мова і літаратура ў школе

Выходзіць з 1988 года
Выдавецтва «Полымя»
Мінск

**ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**
**МІНІСТЭРСТВА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ БССР**

**3(39)'91: САКАВІК**



Гродненский
ЧИ… ЗАЛ
Госуниверситет


## ЗМЕСТ


**ШКОЛА І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ**

**Падлужны Аляксандр** Работа над памылкамі 1933-га . . . . . . . . 3
**Туркевіч Васіль** Украінскае слова ў беларускай школе . . . . . . 7

**МЕТОДЫКА І ВОПЫТ**

**У вянок Максіму**

**Жуковіч Мікалай** У паэтычным садзе (Урок-конкурс) . . . . . . . 10
**Ляшук Вера** Сістэма вывучэння паэзіі Максіма Багдановіча ў VII класе (заканчэнне) . . . . . . . . . . . . . . . 13
**Крайко Святлана** Авалоданнё значымай часткай слова — прыстаўкай . . . 18
Тэксты для дыктовак . . . . . . . . . . . . 20

**ФІЛАЛОГІЯ**

**Навуменка Павел** Невядомы Крапіва . . . . . . . . . . . . 36
**Бельскі Алесь** Крылы маладосці: Маладая беларуская паэзія (працяг) . . 42
**Абабурка Мікалай** Праблемы мастацкага стылю і мовы беларускай літаратуры 53

**МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ**

**Салаўёва Таццяна** Колас і музыка . . . . . . . . . . . . . 57

**КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК**

**Юбко Валянціна** «З Глаголіцы я родам і з Кірыліцы!..»: Метадычныя парады да ўрока-свята славянскага пісьменства і культуры . . . 62

**КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ**

**Барыс Сымон** Краскі вясны: Веснавыя святы . . . . . . . . 68
**Чарняўскі Уладзіслаў** Каталіцкія святы . . . . . . . . . . . . 72

**І песню родную люблю я...**

«Явар і каліна» . . . . . . . . . . . . . . 74

**НА РОСТАНЯХ**

**Пяткевіч Аляксей** «...І Нёман недалёка»: Багдановічы ў Гродне . . . . 76

**Крытыка і бібліяграфія**

**Марціноўскі Пятро** Новы тэрміналагічны даведнік . . . . . . . . 78
Настольныя кнігі . . . . . . . . . . . . 80

**Лінгвістычная мазаіка**

**Шпадарук Іван** Акцёр і артыст, аспірант і кандыдат . . . . . . . 17

**Літаратурны калейдаскоп**

Артыкулы пра Максіма Багдановіча . . . . . . . . 16

**Наш каляндар**

Аляксей Сапуноў (61), Генадзь Кісялёў (75).



© «Беларуская мова і літаратура ў школе», 1991 г.

## СОДЕРЖАНИЕ

**ШКОЛА И НАЦИОНАЛЬНОЕ ВОЗРОЖДЕНИЕ:** *Подлужный Александр.* Работа над ошибками 1933-го (3); *Туркевич Василий.* Украинское слово в белорусской школе (7). **МЕТОДИКА И ОПЫТ:** *Жукович Николай.* В поэтическом саду (Урок-конкурс) (10); *Лешук Вера.* Система изучения поэзии Максима Богдановича в VII классе (13); *Крайко Светлана.* Овладение значимой частью слова — приставкой (18); Тексты для диктантов (20). **ФИЛОЛОГИЯ:** *Науменко Павел.* Неизвестный Крапива (36); *Бельский Алесь.* Крылья молодости: Молодая белорусская поэзия (42); *Абабурка Николаи.* Проблемы художественного стиля и языка белорусской литературы (53). **МЕЖПРЕДМЕТНЫЕ СВЯЗИ:** *Соловьева Татьяна.* Колас и музыка (57). **КОГДА ЗАКОНЧИЛСЯ УРОК:** *Юбко Валентина.* «Из Глаголицы я родом и из Кириллицы!..» (62). **КУЛЬТУРА БЕЛОРУССИИ:** *Борис Семен.* Весенние цветы: О весенних праздниках (68); *Чернявский Владислав.* Католические праздники (72). «Явор и калина» (74). **НА РОССТАНЯХ:** *Петкевич Алексей.* «...И Неман недалеко» (76). **Критика и библиография:** *Мартиновский Петр.* Новый терминологический справочник (78); Настольные книги (80). **Лингвистическая мозаика:** *Шпадарук Иван.* Актёр и артист... (17). **Литературный калейдоскоп:** Статьи о Максиме Богдановиче (16). **Наш календарь:** Алексей Сапунов (61); Геннадий Киселев (75).

***ЗВЯРТАЕМ УВАГУ*** *нашых карэспандэнтаў на тое, што у новым годзе па прычынах, якія ад нас не залежаць, змяніўся паштовы індэкс рэдакцыі часопіса. Цяпер вашы пісьмы, матэрыялы, водгукі мы па-ранейшаму будзем рады атрымліваць на адрас: 220035, Мінск, праспект Машэрава, 47, корпус 1, пад'езд 2.*

*Для наведвальнікаў нагадваем, што ўваход у рэдакцыю знаходзіцца з боку вуліцы Гвардзейскай.*

*Праезд аўтобусамі №№ 29, 36, 44, 69, 77, 91 або тралейбусамі №№ 21, 39, 56 да прыпынку «Вуліца Гвардзейская».*

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:**

**Міхась Шавыркін (галоўны рэдактар), Зінаіда Варановіч, Павел Васючэнка (нам. галоўнага рэдактара), Ірына Граковіч, Раіса Грынкевіч, Уладзімір Дзіско, Павел Дзюбайла, Іван Ждановіч (адк. сакратар), Міхась Лазарук, Аляксандр Лукашанец, Віталь Маслоўскі, Мікола Мішчанчук, Жанна Прыймак, Валянціна Раманцэвіч, Анатоль Рудэнка, Тамара Саўчук, Яўген Цумараў, Міхаіл Яўневіч**

**РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:**

**Міхась Шавыркін (старшыня савета), Людміла Апаровіч, Сямён Барыс, Мікалай Бірыла, Марыя Верціхоўская, Валянціна Войцік, Зоя Громак, Любоў Гарэлік, Рэма Драздова, Лілія Казлоўская, Леанід Кацапаў, Алена Клімкова, Віктар Красней, Міхаіл Крот, Вольга Кузьміч, Людміла Кутузава, Яўген Лаўрэль, Наталля Левічава, Таццяна Лойка, Аляксандр Лугоўскі, Вольга Ляшчынская, Галіна Малажай, Вольга Малініч, Раіса Мілун, Вера Міронава, Віктар Несцяровіч, Яўген Несцяровіч, Тамара Прадзед, Аляксей Пяткевіч, Васіль Рагаўцоў, Аляксей Рагуля, Алена Руцкая, Барыс Сачанка, Здзіслаў Сіцько, Валянціна Смыкоўская, Павел Сцяцко, Тамаш Тамашэвіч, Васіль Туркевіч, Уладзімір Філіновіч, Мікалай Хілько, Таццяна Шамякіна, Мікалай Яленскі**

«БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК И ЛИТЕРАТУРА В ШКОЛЕ»
(на белорусском языке)

Ежемесячный научно-методический журнал
Орган Министерства народного образования БССР. Выходит с 1988 года

Адрес редакции: 220035, Минск, проспект Машерова, 47, корпус 1

Здадзена ў набор 1.02.91. Падп. да друку 12.03.91.
Умоўн.-друк. арк. 7. Умоўн.-фарб. адбіт. 7,52.
Ул.-выд. арк. 8,8. Фармат 70×108 1/16.
Афсетны друк. Тыраж 11600 Зак. 62.
Цана 60 кап.

Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па друку
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79

Дзяжурны рэдактар **Сямён Барыс**
Тэхнічны рэдактар **Галіна Шалай**
Карэктар **Таццяна Славута**
Машыністка **Тамара Міхайлоўская**
Адрас рэдакцыі: 220035, Мінск, праспект Машэрава, 47, корпус 1, пад'езд 2

Тэлефоны:

галоўнага рэдактара: 23-35-17
намесніка галоўнага рэдактара: 23-07-40
адказнага сакратара: 23-07-40
аддзела методыкі: 23-24-69
аддзела культуры і міжпрадметных сувязей: 23-34-79

## *60 гадоў з дня нараджэння Аляксея Пяткевіча*



*Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч — дацэнт Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў СССР, старшыня Гродзенскай гарадской Рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Ён нарадзіўся ў 1931 г. у мястэчку Новы Свержань Стаўбцоўскага раена. Закончыў філалагічны факультэт і аспірантуру Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З 1957 г. працуе на кафедры літаратуры Гродзенскага пед-інстытута імя Янкі Купалы. Быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага універсітэта, чытаў курсы вуснай народнай творчасці, гісторыі беларускай літаратуры, тэорыі літаратуры. З 1990 г.— на кафедры беларускай культуры універсітэта імя Янкі Купалы, чытае курс гісторыі беларускай культуры.*

*Аляксей Міхайлавіч — аўтар больш за 250 друкаваных работ па літаратуразнаўстве і культуры, у тым ліку манаграфіі «Сюжэт. Кампазіцыя. Характар. Аб прозе Кузьмы Чорнага» (1981), раздзелаў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры», т. 2 (1969), «Гісторыі беларускай літаратуры XIX — пач. XX ст.» (1981), краязнаўчых даследаванняў, літаратурных партрэтаў і артыкулаў, рэцэнзіяў.*

Аляксей ПЯТКЕВІЧ

# «...І НЕМАН НЕДАЛЁКА»

Шмат яшчэ засталося ў Гродне астояў — куткоў даўняй забудовы з драўлянымі, спраўна ашаляванымі і пафарбаванымі дамамі, палісаднікамі, гародчыкамі, утульнымі дворыкамі, з якіх нярэдка чуецца — асабліва летам — кудахтанне курэй ці нязлоснае бурчанне сабакі. Ідзеш такою вуліцаю, з прыемнасцю ўдыхаеш пах кветак, цешышся здаровай прахалодай, што плыве з глыбіні агародаў з-пад яблынь, вішняў, кустоў агрэсту, пазіраюць на цябе з-за штыкецін веснічак цікаўныя дзіцячыя вочы, і, здаецца, што час тут спыніўся. Толькі гул недалёкай магістралі нагадвае пра сённяшні горад.

Да нядаўняга часу і невялікая, на адзін квартал, вуліца, што вядзе да старога гарадскога парку, была нешматлюднаю і вельмі каларытнаю. Але ў апошнія дзесяцігоддзі пабудавалі тут сучасныя мураванкі, і толькі дзе-нідзе згадваецца колішняя Садовая. Цяпер гэта вуліца носіць імя Максіма Багдановіча. Апошнім з левага боку (калі выходзіць да парку) стаіць вялікі драўляны дом з мансардаю і мезанінам, з зашклёнаю верандаю — тыповы дом старой Гародні. Тут, у яго сценах, і праходзіла маленства Максіма Багдановіча ў 1892—1896 гг., пра што сведчыць мемарыяльная дошка. Чатыры гады і некалькі месяцаў тупалі ножкі будучага паэта ў кватэры гэтага дома, на ціхай, абнятай зялёнай садоў, ускраіне горада.



**Дом на вуліцы імя М. Багдановіча, дзе жыла сям'я Адама Ягоравіча Багдановіча.**



Сям'я Багдановічаў у Гродне. 1895 г.

Сюды пераехала сям'я Багдановічаў у ліпені: бацька, маці і двое хлопчыкаў — Вадзім і Максім. Праз два гады нарадзіўся сын Лёва. Была гэта сям'я звычайных інтэлігентаў тагачаснага губернскага горада. Панавалі тут шырокія духоўныя інтарэсы, прага ведаў, творчасці. Вылучаліся і беларусазнаўчыя зацікаўленні бацькі, які займаўся этнаграфіяй.

Адам Ягоравіч працаваў у Гродне памочнікам бухгалтара ў Сялянскім «пазямельным» банку. Але сваю неўтаймаваную энергію аддаваў найбольш грамадскім і культурна-асветным справам. Ён быў членам праўлення гарадской публічнай бібліятэкі, членам «Таварыства драматычных пісьменнікаў і кампазітараў». У «Гродненских губернских ведомостях» друкаваў артыкулы і рэцэнзіі на тэатральныя, педагагічныя, літаратурныя тэмы. У Гродне выйшлі на рускай мове яго этнаграфічныя даследаванні.

Маці, Марыя Апанасаўна, натура чулая і багатая, захаплялася музыкаю, педагогікаю, літаратураю. Спрабавала пісаць і надрукавала нават у губернскай газеце апавяданне «Напярэдадні Каляд».

У іх кватэры збіралася прагрэсіўная інтэлігенцыя — настаўнікі, лекары, афіцэры. Музіцыравалі, чыталі, спрачаліся. Шмат увагі аддавалася дзецям. Іх заняткі, забавы, гульні, паветраны мацыён, далучэнне да кнігі і народнай казкі, да прыроды — усё гэта было для бацькоў вельмі сур'ёзнаю справаю. Асабліва самаададдана апекавала сыноў Марыя Апанасаўна, і яны раслі ў доглядзе і мацярынскай ласцы.

«Умовы для выхавання дзяцей былі спрыяльныя,— успамінаў Адам Ягоравіч,— на двары садзік, вакол сады, палі, непадалёку лес, ды і Нёман недалёка. Дзеці ўвесь час на чыстым паветры, клімат мяккі. Увесь вольны час я аддаваў дзецям... Я часта браў іх на прагулянку і ў поле, і ў лес, і на Нёман, цягаў Максіма як меншага за плячыма. Акрамя мяне, маці нікому дзяцей не давярала, а дома пры іх знаходзілася неадлучна».

Светлыя гродзенскія часы нечакана павярнуліся вялікаю бядою. У маі 1896 г. Марыя Апанасаўна, нарадзіўшы дачку, пачала хутка затухаць — выявіліся скарацечныя сухоты,— і ў кастрычніку таго ж года яе не стала. Пахавалі яе на гарадскіх праваслаўных могілках, у цэнтры, каля капліцы.

Тады, у 1896-м, Адаму Ягоравічу цяжка было заставацца ў Гродне, і ў лістападзе ён з дзецьмі (маленькая дачка памерла), з сёстрамі Марыяй і Магдалінай выехаў у Ніжні Ноўгарад.

Самотная магіла маці засталася недагледжанаю і забытаю. «Была даручана апецы маіх сяброў»,— пісаў А. Багдановіч. Але ні сябры, ні тым больш няўмольны час не маглі захаваць магілу. Гады не зберагалі і дубовы крыж з таблічкаю, пастаўлены паводле хрысціянскага звычаю. У пасляваенную пару на месцы магілы не было ўжо ніякага знака. Толькі ў 80-я гг. гродзенскія прыхільнікі вялікага беларускага паэта аднавілі дарагое для ўсіх месца спачыну Марыі Апанасаўны.

Некалькі гадоў таму назад мясцовы краязнавец А. П. Госцеў выявіў яшчэ адзін гродзенскі адрас Багдановічаў. Архіўныя матэрыялы засведчылі, што ў 1896 г. сям'я жыла ў Гродне на новым месцы — на вуліцы Палявой (цяпер Карбышава). Трэба меркаваць, што пераезд на іншую кватэру мог адбыцца незадоўга да смерці Марыі Апанасаўны. Магчыма, Адам Ягоравіч намерыўся палепшыць кватэрныя ўмовы сям'і, каб падтрымаць такім чынам хворую. Хто ведае?

Так ці інакш, восенню 1896 г. Максім Багдановіч назаўсёды пакінуў горад свайго маленства, горад, дзе засталася яго маці. Напэўна, гродзенскія ўражанні, хоць і дзіцячыя, адкладаліся глыбокім следам у яго душы. Жывучы пазней у Расіі, у вялікай і тлумнай сям'і бацькі, ён заставаўся адзінокім. Вобразы холаду, цемені, імжы, што добра перадавалі драматызм яго светаадчування, падказваліся і асабістым лёсам. Вобразы святла, таксама вельмі характэрныя для яго лірыкі, жывіліся нашаніўскаю Вільняю, па-вясковаму паэтычнаю Ракуцёўшчынаю і, вядома ж, горадам той даўняй яго пары, мясцінамі з-пад Немана, дзе пракладаліся сумесныя з маці першыя жыццёвыя сцяжыны.

Можа, згадка, уяўленне пра іх і нарадзілі элегічныя, урачыста-прасветленыя радкі ў адным з яго гістарычных вершаў:

*І жалобна, сумна трубы*
*У Гародні граюць.*